**І.Ф. Лобан** (Віцебск)

# МАСТАЦКА-ГЕРМЕНЕЎТЫЧНАЕ АСВАЕННЕ ВОБРАЗА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Вобраз Еўфрасінні Полацкай у сучаснай беларускай паэзіі распаўсюджаны, аднак такая акалічнасць не была заканамернай рысай літаратурнага працэсу ўсяго XX ст. Гістарычна вобраз Еўфрасінні задаецца хрысціянскай літаратурай: жыціем святой (першая спроба паказаць характар асветніцы і яе духоўнае ўзыходжанне), а таксама аўтарамі хрысціянскай паэзіі мінулых стагоддзяў (Кірылам Тураўскім і Сімяонам Полацкім). Дзейснае ўшанаванне беларускай святой праз паэтычную вобразнасць перарасло ў літаратурную традыцыю. Сёння вялікую ролю ў фарміраванні нацыянальнай традыцыі мастацкага асэнсавання жыцця і дзейнасці святой адыгрываюць найбольш яркія выразнікі гістарычнай і духоўнай самасвядомасці свайго народа. Гістарызм мыслення пісьменнікаў немагчымы без усведамлення ўсяго багацця нацыянальнай культуры, без арганічнага звароту да духоўных запаветаў народа. Традыцыі прыгожага пісьменства на Беларусі суадносяцца з яе хрысціянізацыяй, таму натуральна, што паэтычны вобраз Еўфрасінні ўпершыню з'яўляецца ў "Пахвале Еўфрасінні Полацкай" Св. Кірылы Тураўскага:

Еуфросиниа – небопарный орел,
попаривши от Запада и до Востока, яко лунасолнечная,
просветивши всю землю Полоцкую! [1, с. 60].

Вобраз Еўфрасінні сцвярджае моц хрысціянства, якое прынесла асвету на Полацкую зямлю. Традыцыйная, нават у паэтычным творы, рэмінісцэнцыя з "Жыція":

Бяше бо помощьница обидемым, скрьбящим утешением,
нагим одеяние, больным посещение, просторище всем [1, с. 60].

Шлях Еўфрасінні азначаны дзейсным распаўсюджваннем хрысціянскай веры, жыццёвым прыкладам дабрачыннасці, пакоры і любові. У такіх характарыстыках задаецца правобраз Хрыста, на шлях якога арыентуюцца ўсе святыя Хрысціянскай Царквы. Біблейскія алюзіі бачацца ў малітоўным заканчэнні "Пахвалы": "Молися Богу о стаде своем", якое сцвярджае Боскае апякунства над зямлёй беларускай, вверанай маці нашай Еўфрасінні. "Пахвала" як і "Жыціе" пачынаецца рытарычным уступам:

Ким убо языком достоить нам похвалити, братие,
светозарную память преблаженныя невесты Христовы –
Еуфросинии?! [1, с. 60].

Кірыла Тураўскі ў традыцыях агіяграфіі хацеў наблізіць "Пахвалу" да "Жыція", праўда, у паэтычнай форме.

Ідэю хрысціянскага асветніцтва праз вобраз Еўфрасінні Полацкай падкрэслівае і Сімяон Полацкі. Ён будуе ў "Пралозе да Найпадобнай Маці Еўфрасінні" ланцужок вобразаў – сімвалаў хрысціянскай веры: Еўфрасіння – Найпадобная – Ікона – Маці – Полацк – асветніцтва:

Убо, о мати, припади за нами
К Господу Богу твоими рабами,
Да возвратит нам икону святую,
Просвети землю белороссийскую.
Моли прилежно и Деву Марию,
Да проявит нам милость свою сию,
Да не небрежет отчинна ти града
И не оставит правоверна стада [1, с. 68].

Пролаг з’яўляецца своеасаблівай літаратурнай малітвай, звернутай да полацкай святой. Ён напісаны ў жанры элегіі, а па форме нагадвае плач-лямант. Рэлігійныя перажыванні пераплецены з высокімі грамадзянскімі пачуццямі паэта, які моцна любіць свой горад і непакоіцца, што некаторы час яго землякі пазбаўлены дапамогі галоўнай патронкі Беларусі. Элементы барочнай стылістыкі надаюць вершу слоўную пышнасць і ўзнёсласць. У вобразе святой адлюстроўваецца Боскае заступніцтва за Беларусь.

Як вядома, пачынальнікам вобразнага звароту да Еўфрасінні ў беларускай прозе лічыцца В. Ластоўскі. Разважаючы пра распаўсюджанне хрысціянскай веры на Беларусі ў вершы “Дума на Полацкім замчышчы”, ён алюзійна ўспамінае полацкую святую:

…на попеле
Старэтных стодаў,
Пад засцю ценяў іх –
У почце грэчаскіх святых
Засела Софас,
Мяйсцовую сабой
змяняючы Паладу. [2, с. 183].

Такім чынам, матывы хрысціянскай літаратуры не былі падтрыманы паэтычнай думкай да пачатку ХХ ст., таму В. Ластоўскага можна лічыць адноўцам хрысціянскага мастацка-герменеўтычнага асэнсавання вобраза Еўфрасінні ў беларускай паэзіі.

У ХХ ст. рэлігійнае мысленне саступае сваё першаснае месца навуковаму, таму мяняецца і падыход да адлюстравання вобраза святой. У вершы “Цень Ефрасінні” А. Звонака Еўфрасіння ўжо сімвалізуе вобраз мінуўшчыны:

Пахла воскам у прыцемку сінім.
І здавалася з дна тайнікоў
Свецяць вочы Вялікай Княгіні…
Гэта здань твая, Ефрасіння,
Мільганула з глыбінь вякоў! [1, с. 88].

Л. Геніюш у паэме “Даўніна” яднае хрысціянскую і патрыятычную тэмы, упершыню стварае яскравы апісальны вобраз славутай палачанкі:

А ў замку князёўна расце, як вярба,
Лагодная. З ласкі ўся і з дабра.
Прадслава, галубка Прадслава –
Бацькі яе клічуць ласкава.
Дзяўчына, бы жытні колас,
Русыя косы па пояс,
Кветкі ў белых далонях,
Вочы – Дзвіны прадонне.
Шаты з славянскай белі,
Вусны – жар вішняў спелых,
Стан, бы ў бярозкі любай,
Якую вятры галубяць,… [3, с. 366–367].

Такой дакладнай абмалёўкі знешнасці Еўфрасінні не знойдзеш нават у прозе. Вядома, што адной з адзнак беларускай паэзіі з’яўляецца яе цесная сувязь з фальклорам. Еўфрасіння параўноўваецца з галубкай, вярбой, жытнім коласам, бярозай. У названых параўнаннях – відавочная традыцыйная этнасімволіка. Хрысціянская характарыстыка даецца радком: “Лагодная. З ласкі ўся і дабра”. Тэматычна паэма “Даўніна” Л. Геніюш набліжана да аповесці “Прадыслава” В. Іпатавай. Тыпалагічнае падабенства дзвюх Еўфрасінняў узнікае праз сінтэзаванасць у вобразе язычніцтва і хрысціянства, праз акцэнтаванне імкнення Еўфрасінні спыніць княжацкія войны. Аднак у адрозненне

ад В. Іпатавай Л. Геніюш не пераўзвышае нацыянальнае над рэлігійным. Таму вобраз Еўфрасінні ў паэме “Даўніна” гарманічны, але ні ў якім разе не ідэальны.

У большасці вершаў савецкага пакалення беларускіх паэтаў вобраз Еўфрасінні непарыўна звязаны з родным краем, з беларускім лёсам, таму ў іх іншы раз узнікаюць зусім не хрысціянскія знакі, сімвалы, што суправаджаюць вобраз святой. У адным са сваіх вершаў Р. Барадулін як лірычны герой натхняецца вобразам фрэсак Еўфрасіннеўскай царквы і разважае… аб самотнасці [4, с. 22]:

На ветры часу стыне веры крыца.
Красой падзольнай думку расцвялі.
У крыжакрылай келлі Еўфрасінні
Згадаецца акрайчык неба сіні
І посах, што падаўся ў бабылі [1, с. 126].

Вобраз Еўфрасінні як асобы, што робіць гісторыю, узнікае ў вершы “Літанія” Д. Бічэль-Загнетавай. Паэтка слаўнай палачанцы прысвяціла вялікі цыкл вершаў пад агульнай назвай “Ефрасіння Полацкая”. Гэта своеасаблівы лірычны жыццяпіс нашай святой, яе гераізацыя і ўслаўленне:

Сілай духоўнай узвысіла Полацк высока.
Тым, хто імкнуўся да кнігі, свяціла, як зорка.
Мове, адзінай дзяржаве шчэ толькі злучацца.
Свет нас прымаў як народ па адной палачанцы.

Жаночы аспект вобраза Еўфрасінні (яе выбар не замужняга, а манаскага шляху) вельмі распаўсюджаны ў 80–90-я гады XX ст. з эпатажным адкрыццём сэксуальнасці, фемінізму і гендэру. Новае пакаленне паэтаў ужо абвяшчае аб гэтым нават у назве: Людміла Рублеўская “Ефрасіння” (Балада аб жаночай волі)”. Святая абрала шлях Веры, хутчэй ад гонару, таму што жадала пазбегнуць жаночай долі [4, с. 22]:

…Прадслава хоча стаць упарта
Святой –
І вольнаю, як вецер [2, с. 235].

Тэма волі ў сувязі з выбарам Еўфрасінні веры, волі як веры, была заяўлена яшчэ ў 60-я гг. А. Лойкам. У яго вершы таксама сустракаюцца рэмінісцэнцыі з “Жыція”:

Праўды шукае, міру
І жывым і магілам,
Шчасця – ніцым, сірым,
Бедным, галодным, хілых. [1, с. 119].

У цэлым у паэзіі вобраз Еўфрасінні сімвалізуе святасць, хрысціянскую веру, асвету і мінуўшчыну. Так, сімволіку святасці закранае ў вершы “Святы покрыў над Беларуссю” Алег Бембель, дзе вобраз Еўфрасінні ўвасабляецца ў знаку Святога Духу:

Птушка белая над Краінай сіняй –
то ахова наша і сіла…
гэта дух святой Еўфрасінні…[1, с. 153].

Мяняюцца і жанравыя формы паэзіі: з’яўляюцца літанія, малітва. Адсюль і новая мастацкая мова: асаблівая пяшчота эпітэтаў і параўнанняў, інтымнасць лірычнага споведу.

Наша беларуская літаратура ў многім застаецца асветніцкай, што знайшло адбітак і ў паэзіі. Апошняя выступае сродкам аб’яднання людзей у пэўную маральна-гуманістычную цэласнасць. Сёння, калі яна траціць нешта істотнае ў сваёй традыцыйнай духоўнасці, традыцыі вялікай Еўфрасінні набываюць асаблівую значнасць і актуальнасць. Менавіта вяртанне чалавека да рэлігійных духоўных каштоўнасцей у наш час з’яўляецца вынікам крызісу бездухоўнасці. Праявы апошняй выявіліся ў адсутнасці мэт і ідэалаў, сэнсу асабістага быцця, нізкай каштоўнасці чалавечай асобы, абсалютным

бязвер'і, страце сумленнасці, годнасці. Ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі чалавек гоніцца за асабістымі выгодамі, прапагандуе прагматычную мараль. Вядучымі каштоўнасцямі становяцца багацце, грошы, улада, а сродкамі іх дасягнення – насілле і падман. Беларуская паэзія другой паловы XX ст. ідзе шляхам да гістарычнага, нацыянальнага і хрысціянскага Адраджэння.

**Літаратура**


1. Насустрач Духу: Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі / Уклад. і прадм. І.А Чароты. – Мінск: Ураджай, 2001. – 238 с.
2. Бацькаўшчына: зб. гіст. літ.; уклад., прадм. С. С. Панізніка. – Мінск: Юнацтва, 1998. – 335 с.
3. Геніюш, Л. Гасціна: Выбранае / Уклад. З. Пазняк. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 382 с.
4. Лысова, Н. Б. Вобраз Ефрасінні ў сучаснай паэзіі. Спроба культуралагічнага аналізу / Н.Б. Лысова // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. Культурология. Том 1. – 2002. – № 4 – С. 21–25.



**Д.Р. Мышко** (Гродна)


## РОКАЙЛЬНАЯ АТМОСФЕРА В СТИХОТВОРЕНИЯХ С.ТРЕМБЕЦКОГО

Польский классицизм XVIII века был неразрывно связан с именем Станислава Августа (1764 – 1795), с деятельностью сторонников королевских реформ, направленных прежде всего на преображение шляхтича из сармата в гражданина и патриота. В связи с этим классицизм в Польше был не столько литературной доктриной, сколько средством идеологической борьбы со шляхетским произволом. Король, организуя знаменитые обеды по четвергам, сплотил вокруг себя интеллектуальную элиту страны. Особой благосклонностью короля пользовался Станислав Трембецкий (1739 – 1812), жизнь, судьба и творчество которого являли классический образец придворного поэта.

Среди тройки польских классицистов (АП.Нарушевич, И.Красицкий) С.Трембецкий выбрал особый путь. М.Климович связывает неповторимость классицизма Трембецкого с отсутствием в его поэзии сатирического и дидактического начала, так свойственного польскому Просвещению, и приближением к придворному рококо [2, с.73]. В.Боровы отмечает не свойственное станиславовскому классицизму чувство элегантности, грациозности и деликатности, но в полной мере проявляющееся в поэзии Трембецкого и делающее ее специфическим вариантом польского просветительского классицизма [1, с.195]. «Специфический профиль» классицизма поэта С.Петрашко усматривает в «страсти к форме, культе слова и виртуозным владением им, вознесение категории привлекательности на вершину эстетических ценностей» [4, с.359]. Все это делало Трембецкого более современным и европейским, отделило его от основного течения в просветительской мысли Польши.

Специфика положения С.Трембецкого среди станиславовских классицистов объясняется пониманием поэтом категории *прекрасное*. Программно за этой категорией было закреплено значение, выражаемое латинским *pulchrum* (то, что гармонично). Прекрасное у классицистов ассоциировалось прежде всего с совершенным, возвышенным, тем, что подверглось селекции разума. Классицистический вкус был задан образцом. Трембецкий понимал *прекрасное* как латинское *bellum* (то, что нравится, то, что притягательно). *Прекрасное* стало синонимом *красивого*, причем критерием разграничения становится индивидуальный вкус. *Красивое* сделало субъективность эстетической ценностью, а эмоциональность оказалась возведенной в культ. В результате в 1770-х годах в классицистическую по функциям и заданиям поэзию С.Трембецкого начинают проникать рокайльные элементы. Если вспомнить тот факт, что поэт формировал и шлифовал свой вкус во Франции, среди галантных дам и кавалеров, то появление рокайль-